

ГАЛАВА АД ПОСПЕХУ НЕ КРУЖЫЦЦА

ЧЫРВОНКА

АКАДЭМІК, ПЕРШЫ ХІРУРГ-ТРАНСПЛАНТОЛАГ, МІНІСТР **12**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 СНЕЖНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 236 (29858)


**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Аляксандр КАДЛУБАЙ, намеснік міністра адукацыі:**

*«Мы бачым, што ідзе колькасны рост удзельнікаў студатрадаўскага руху. Пашыраецца і кірунак работы беларускіх студатрадаў за мяжой. У прыватнасці, у Расійскай Федэрацыі. Упэўнены, што ёсць яшчэ куды рухацца. Акрамя таго, што павінна павялічвацца студатрадаўская колькасць, яна павінна перарастаць у якасць. Значэнне студатрадаў немагчыма пераацаніць, паколькі студатрады — гэта не толькі ўцягванне моладзі і арганізацыя іх вольнага часу, але і магутны інстытут сацыялізацыі і ідэалагічнага выхавання нашага падрастаючага пакалення».*

# ПРАЦА ДЛЯ РАДАСЦІ



Фота БелТА.

У Магілёўскім дзяржаўным эканамічным прафесійна-тэхнічным каледжы дзейнічае Цэнтр прафесійнай і сацыяльнай рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў і дзяцей з асаблівасцямі развіцця, які фарміруе інклюзіўную культуру ў грамадстве да людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Сярод мерапрыемстваў установы адукацыі — творчыя праекты з удзелам дзяцей-інвалідаў. Цяпер навучэнцы каледжа сумесна з педагогамі рыхтуюць сувеніры да навагодніх свят. Чым, уласна і займаюцца на гэтым фота Лідзія АДАМОВІЧ, Анастасія ЛЯЦКАЯ і педагог дадатковай адукацыі Вольга ГАЙДУК.

**КОРАТКА**

- Беларусь лідзіруе ў Еўропе па вытворчасці малака і малочных прадуктаў: 841 кг на чалавека ў год.
- **Старшынёй праўлення Беларускага фонду міру пераабраны Максім Місько.**
- Свята сустрэчы Снягуркі арганізуюць 3 снежня ў маёнтку Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы.
- **У Барысаўскай ЦРБ правялі першую аперацыю па ўстаноўцы электракардыястымулятара.**
- Абмежаванні на наведванне пагранпаласы ў Гомельскай вобласці прадоўжаны да 1 сакавіка 2023 года.
- **Калядныя кірмашы ў Мінску пачнуць працаваць з 17 снежня.**
- У Брэсцкай вобласці 84 працэнты дзяцей ад маці з ВІЧ аказаліся здаровымі.

Нашы людзі

## ЗАЛАТЫ ФОНД ВАЛАНЦЁРСКАГА РУХУ

### Як у Мядзельскім раёне пажылыя людзі дапамагаюць іншым



**Не кожны можа падняцца над асабістымі праблемамі, убачыць чужыя клопаты і беды, узваліць іх на сваё плечы, дарыць людзям надзею, радасць. Такія якасці ўласцівы валанцёрам. Менавіта яны аказваюць дапамогу тым, хто мае ў ёй патрэбу. У добрую справу не трэба ўкладваць вялікія матэрыяльныя і фінансавыя затраты, акрамя часцінкі сваёй душы.**

**СТАР. 3**

Разумныя грошы

## У ПОШУКУ НАЙЛЕПШЫХ КРЭДЫТАЎ

### Бліжэйшым часам плануецца распрацаваць спецыяльную крэдытную праграму для куплі насельніцтвам камплектаў дамоў беларускіх вытворцаў

**Калі вы хочаце ўзяць самы выгадны крэдыт, цяпер трэба звярнуць увагу на акцыі і спецыяльныя прапановы банкаў. Шматлікія кампаніі гатовыя прапанаваць грошы пад невялікі працэнт на даволі лаяльных умовах.**

Працэнтныя стаўкі залежаць ад таго пакета дакументаў, які можа прапанаваць чалавек. Без дадатковых выдаткаў атрымаць грошы на выгадных умовах можна толькі ў двух выпадках. У першым — гэта будуць уладальнікі станоўчай крэдытнай гісторыі, а ў другім — катэгорыі грамадзян, якія маюць права на выкарыстанне льготных праграм.

**СТАР. 5**

ISSN 1990 — 763X


**Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.**

